Ураджай-2021

# ГАРАЧАЯ ПАРА

## У «РАПСЕ» ЗБІРАЮЦЬ РАПС

...На гадзінніку адзінаццаць. У работнікаў механізаванага звяна ААТ «Рапс», што ў Мінскім раёне, надыходзіць час абедзеннага перапынку. На ўскрайку поля іх ужо чакае фургон з гарачай ежай. Цяжкагрузныя МАЗы і магутныя камбайны «Палессе» адзін за адным спыняюць работу, механізатары і кіроўцы падыходзяць да аўтамабіля, дзе іх чакае раздатчыца Алена Пясняк. Тут таксама знаходзіцца намеснік дырэктара гаспадаркі па ідэалагічнай рабоце Ларыса Ружанцова, якая знаёміць працаўнікоў з апошнімі вынікамі па зборы і перавозцы ўраджаю бягучага года. Асноўныя клопаты па забеспячэнні работнікаў гарачым абедам узяла на сябе старшыня прафсаюзнага камітэта сельскагаспадарчага прадпрыемства Любоў Ціцянкова.

Адным з лідараў спаборніцтва сярод механізатараў гаспадаркі не першы год з'яўляецца Валерый Петушкоў — машыніст-трактарыст першага класа. У ААТ «Рапс» ён працуе каля дзевяці гадоў, а ўвогуле Валерый Мікалаевіч правёў недзе 25 уборачных. Раней ён жыў і працаваў у Рэспубліцы Казахстан, адкуль пераехаў на новае месца жыхарства ў Беларусь.

— Работай у ААТ «Рапс» я задаволены. Камбайн у мяне, зрэшты, як і ў многіх маіх калег, амаль новы, магутны і вельмі зручны. Беларускія машынабудаўнікі ствараюць вельмі добрую сельгастэхніку. У кабіне «Палесся» ўстаноўлены кандыцыянер, спёка зусім не адчуваецца. Добрая шумаізаляцыя, кіраваць магутнай машынай вельмі лёгка. Летась я адпрацаваў на ім з вялікім задавальненнем. І намалаціў, дарэчы, 2100 тон збожжа і рапсу.

Рапс мы пачалі збіраць некалькі дзён таму. За чатыры дні я намалаціў каля 170 тон. Але гэта толькі пачатак кампаніі. Думаю, што і сёлета абавязкова буду сярод тысячнікаў, а калі пашанцуе, то займу першае месца ў спаборніцтве. А яшчэ хачу дадаць, што сярод нас — механізатараў і кіроўцаў — склаўся вельмі дружны, згуртаваны калектыў. Я ведаю, што калі ўзнікне неабходнасць, кожны з маіх таварышаў адразу мне прыйдзе на дапамогу. У такім калектыве нізкія вынікі па зборы збожжа мець, самі разумееце, сорамна. Агульны настрой на будучы ўраджай у нас вельмі добры.

Як паведаміў намеснік дырэктара ААТ «Рапс» па сельскагаспадарчай вытворчасці Андрэй Ількевіч, агульная плошча ворных зямель у гаспадарцы складае 4 700 гектараў. Асноўныя культуры — каласавыя збожжавыя і зернебабовыя культуры. Пад іх адведзена 1800 га. Пасевы азімага рапсу займаюць 800 гектараў. 1250 га адведзена пад кукурузу і 700 га займаюць шматгадовыя травы.

— Сёлета ўборка азімага рапсу пачалася на 10 дзён пазней у параўнанні з мінулым годам, — падкрэсліў Андрэй Ількевіч. — Прычына — зацяжная і халодная вясна, вегетацыя раслін цягнулася даўжэй, чым звычайна. На працягу чатырох дзён убралі 30 % плошчы, намалацілі больш за 700 тон у бункернай вазе пры сярэдняй ураджайнасці 29,3 цэнтнера з гектара. Гэта крыху менш, чым летась, калі ўраджайнасць складала 30 ц/га. Але я спадзяюся, што з цягам часу мы ўсё ж такі наблізімся да таго паказчыка. Дарэчы, валавы збор рапсу ў мінулым годзе склаў 2550 тон у бункернай вазе. Калі ўсе будзе добра, сёлета мы збяром 2400 тон рапсу.



У полі — з добрым настроем. Члены механізаванага звяна разам з Ларысай РУЖАНЦОВАЙ, Любоўю ЦІЦЯНКОВАЙ і галоўным аграномам Андрэем Сяргеевічам.

По словах намесніка дырэктара гаспадаркі, вырошчванне рапсу — справа выгадная. За год цана вырасла амаль удвая. Аднак дадзеная культура — даволі працаёмкая, нават капрызная. Патрабуе праводзіць 3-4 вегетатыўныя апрацоўкі, абавязковая апрацоўка ад хвароб, і, безумоўна, унясенне поўнага спектра мінеральных угнаенняў з поўным захаваннем тэхналогіі сяўбы.

— Звычайна мы ўбіраем каля 100 гектараў у дзень, — працягвае суразмоўнік. — Спадзяюся, што за 5-6 дзён управімся. А потым без перапынку пачнём убіраць азімыя збожжавыя. На сённяшні дзень вільготнасць складае 18–20 %, і таму ўжо можна пачынаць уборку гэтых культур. Аптымальная вільготнасць складае 15–16 %.

У гаспадарцы наладжана перапрацоўка рапсу. З яго вырабляюць алей і макуху, якая карыстаецца попытам у іншых сельгаспрадпрыемствах. Што датычыцца алею, то яго ахвотна купляюць у тым ліку ў замежных краінах. Карацей кажучы, стаўка на рапс сябе апраўдала.

— Сёння мы павінны забяспечыць гарачым харчаваннем на рабочых месцах 65 чалавек, — расказала Любоў Якаўлеўна. — З 11 да 13 гадзін усе людзі павінны быць накормленыя. Кіраўніцтва гаспадаркі выдзеліла ў наша распараджэнне два аўтамабілі, таму паспяваем аб'ехаць усе вытворчыя ўчасткі і накарміць людзей. Якасцю харчавання работнікі задаволеныя, ніякіх скаргаў у наш адрас не было.

У меню абавязкова прысутнічае свежая гародніна, усе маюць магчымасць атрымаць і «першае», і «другое», і «трэцяе». У такое гарачае надвор'е прадугледжана двухразовая выдача мінеральнай вады. Застаецца толькі пажадаць усім смачна есці!



Салодкім кампотам частуе працаўнікоў Алена ПЯСНЯК.

**Сяргей РУЧАНАЎ,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Экіпаж бацькі і сына Міхаіла і Віталя САЛДАЦЕНКАЎ (ААТ «Чамярыскі»).

## Жніво — на добрых абаротах

**На Гомельшчыне запаветныя рубяжы ў тысячу тон намалочанага і перавезенага збожжа ў канцы мінулага тыдня скарыліся экіпажам камбайнераў і кіроўцам дзвюх гаспадарак Брагінскага раёна. Лідараў жніва павіншаваў старшыня аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

На паўднёвым усходзе Беларусі два гады запар на жніве першымі тысячнікамі становяцца супрацоўнікі ААТ «Чамярыскі», што на Брагіншчыне. Летась амаль дзень у дзень передавікі гэтай гаспадаркі за першыя тысячы прымалі віншаванні ад кіраўніка рэгіёна. У мінулым годзе зноў жа дадзенае сельгаспрадпрыемства ў ліку першых на Гомельшчыне завяршыла ўборку збожжавых каласавых. З сямі экіпажаў камбайнераў, што былі задзейнічаны на ўборцы хлеба, шэсць — у перадавіках рэгіёна. Цяпер супрацоўнікі ААТ «Чамярыскі» зноў у лідарах. Дарэчы, брагінскія камбайнеры — першыя ў Беларусі, хто дасягнуў адзнакі ў тысячу намалочаных тон збожжа менавіта на айчыннай тэхніцы.

Дарэчы, тэмпамі жніва ў гаспадарцы вызначыліся адразу дзве брыгады. Так, намалот у тысячу тон збожжа на асабістым рахунку экіпажа бацькі і сына — **Міхаіла і Віталя САЛДАЦЕНКАЎ**, а таксама ў тандэма братоў **Пятра ЯФІМЕНКІ** і **Міхаіла ГАЛКО**. Міхаіл Салдаценка выходзіць на жніво с 2008 года. Летась яго экіпаж таксама быў у лідарах.

— За гэты час пабываў шэсць разоў на рэспубліканскіх «Дажынках». Адна з цяжкіх прафесій. Хваляванні вельмі вялікія. Сёлета ўраджайнасць на палях — у сярэднім 26 цэнтнераў з гектара. Мэта ў мяне — паўтары тысячы любой цаной, ну, да двух тысяч, — дзеліцца Міхаіл Салдаценка.

Другі сезон камбайнер збірае ўраджай у тандэме з сынам, які яшчэ вучыцца. На вакацыях малады чалавек дапамагае ў полі.

— Сярод экіпажаў пануе спаборніцкі дух, і гэта добры стымул у рабоце, — упэўненыя бацька і сын Салдаценкі. Між тым, цяпер, кажуць, быць асабліва пільнымі экіпажы абавязвае надвор'е. Анамальная гарачыня, што апанавала Гомельшчыну, — выпрабаванне для тэхнікі. Экіпаж Салдаценкаў старанна сочыць, каб камбайн не пераграваўся, пажарная бяспека, вядома, на асаблівым кантролі.

У адзіным звяне з экіпажамі камбайнераў-перадавікоў — і кіроўцы-тысячнікі. У ААТ «Чамярыскі» гэта **Уладзімір МЯТЛІЦКІ**, **Аляксандр КРАЎЧАНКА**, **Канстанцін АЛІШЭЎСКІ**, **Рыгор МАЛОЧКА**. Тысячны рубеж па адвозцы збожжа перайшлі і кіроўцы ААТ «Імя Жукава» — **Уладзімір ШАХНІЦКІ** і **Вячаслаў ГАНЧАР**.

Малады кіроўца Канстанцін Алішэўскі — у ліку лідараў адразу ў двух заліках — агульным і сярод моладзі. Ён заняты на адвозе новага ўраджаю чацвёрты год, другі год запар выбіваецца ў лідары.

— За дзень робім ад 10 да 15 рэйсаў, гэта каля 200 кіламетраў. Стараемся, каб менш прастойвала тэхніка. Прачынаецца нават нейкі азарт: хто першы пад'едзе да камбайна, — прызнаецца Канстанцін. — Дзякуй інжынерам, дапамагаюць падтрымліваць тэхніку ў добрым стане. Увогуле працаваць вельмі падабаецца. Пакуль маладыя — энергіі хапае.

Дарэчы, вельмі высокія тэмпы ўборкі не толькі на Брагіншчыне. У перадавіках таксама Мазырскі, Хойніцкі, Светлагорскі раёны. А вось лідзіруе па ўраджайнасці Рэчыцкі раён. Тут у сярэднім на круг намалочваюць 30,7 цэнтнера, на другім месцы Буда-Кашалёўскі раён з 30,1 ц/га, на трэцім месцы Добрушскі раён з 28,2 ц/га. Наогул, аграрыі Добрушчыны блізкія да запаветнага рубяжа ў тысячу тон намалочанага і перавезенага збожжа. Сярод лідараў жніва ў Добрушскім раёне — ААТ «Калінінскі».

Цяпер рабочы дзень у гэтай гаспадарцы пачынаецца каля сямі гадзін раніцы і працягваецца да дзевяці вечара. Працуюць камбайнеры сапраўды з поўнай самааддачай. Летась у гаспадарцы былі чатыры экіпажы-тысячнікі, сёлета ёсць падстава паўтарыць мінулагодні вынік. **Старшы камбайнер Пятро САМОЙЛЕНКА** ў гаспадарцы з 1989 года. У мінулым годзе яго экіпаж намалаціў больш як пяць тысяч тон збожжа.

— Сёлета таксама плануем спрацаваць добра, але многае залежыць ад тэхнікі. Трэба, вядома, імкнуцца добра працаваць, — нешматслоўна, але ёміста адзначае механізатар ААТ «Калінінскі» падчас кароткага перапынку на сняданак — на палеткі прыехала «сталоўка на колах». Час для прыняцця ежы не рэгламентуецца, але звычайна гэта не больш як 15 хвілін.

У гаспадарцы кіпіць работа і на зернетаку. Адначасова з уборкай ідзе падрыхтоўка зерня ўжо да наступнага сельскагаспадарчага года. З сабранага ўраджаю адбіраецца найлепшае зерне, якое пасеяць вясною.

Як адзначылі ў гаспадарцы, у 2019 годзе тут сабралі каля шасці тысяч тон збожжа. Летась — дзевяць з паловай. Сёлета плошча палеткаў са збожжавымі культурамі засталася практычна тая ж, але ўраджайнасць вышэйшая. Гэта дае падставу разлічваць на больш значны намалот, тлумачыць **дырэктар сельгаспрадпрыемства Віктар БАЙДАЎ**.

— Упэўнены, што зможам перасягнуць намалот мінулага года не менш чым на тысячу тон. Паралельна адразу вядзём адгрузку зерня дзяржаве, дзяржзаказ па здачы збожжа ўжо выкананы больш чым на палову, — распавёў ён.

Між тым у цэлым на Гомельшчыне пад збожжавыя сёлета адведзена 348 тысяч гектараў. Кіраўніцтва рэгіёна ставіць перад аграрыямі задачу сабраць ураджай без страт.

— Пасяўную мы правялі ў аптымальныя тэрміны, хоць і было двухтыднёвае адставанне ад мінулага года. У працэсе вегетацыі бачылі, што збожжа наліваецца эфектыўна, біялагічная ўраджайнасць была больш за 30 ц/га, аднак адмоўна на вынік паўплывалі ўмовы надвор'я. Нашы механізатары не спыняюцца, убіраюць, — звярнуў увагу падчас цырымоніі ўзнагароджання першых тысячнікаў па намалоце і адвозцы збожжа новага ўраджаю **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ**. — Мы нацэленыя на тое, каб выйсці на ўзровень не ніжэйшы за мінулы год.

Сёння на большай частцы тэрыторыі вобласці склаліся спрыяльныя ўмовы надвор'я для жніва: спякота крыху спала, прайшлі дажджы. Тэхніка працуе ад відна да відна. У гэтую гарачую пару ў рэгіёне задзейнічаюць больш за тысячу збожжаўборачных машын.

У сваю чаргу, па аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча, па стане на 27 ліпеня на Гомельшчыне ўбрана 34,6 % уборачнай плошчы збожжавых і зернебабовых культур (без уліку кукурузы, грэчкі і проса), штодня прыбіраецца звыш 3 %. Аграрыі рэгіёна ўжо зрабілі важкі ўнёсак у агульнарэспубліканскі каравай — намалочана 284,2 тысячы тон збожжа.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Ірыны СТЫЧЫНСКАЙ.**

# НЕПАЖАДАНЫЯ «СУСЕДЗІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Супрацоўнікі МНС згадваюць леташні выпадак, калі ў адным з дамоў незвычайнай планіроўкі каля аграгарадка Волма пад дахам завяліся восы, памер гнёздаў якіх дасягаў метра-паўтара. Дарэчы, у сітуацыях, калі насякомыя пагражаюць жыццю і здароўю людзей, ратавальнікі дапамагаюць бязвыплатна. Гэта актуальна і тады, калі званок паступіў з дашкольных устаноў, дамоў састарэлых і інвалідаў, бальніц, школ, пазашкольных і сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў. Калі ж камусьці здаецца, што яго «атакавалі» насякомыя, а насамрэч прамой пагрозы жыццю і здароўю няма, то трэба тэлефанаваць па нумарах 101 або 112 — у службе раскажуць, як знішчыць гняздо самастойна.

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ВАС УКУСІЛІ:



- хутка выдаліце джала: калі яно засталося, саскрабіце яго пазногцем, тупым бокам нажа, пластыкавай карткай, пінцэтам;
- месца ўкусу апрацуйце любым антысептыкам (спіртам, растворам нашатырнага спірту, настойкай календулы або марганцоўкі);
- прыкладзіце да месца ўкусу што-небудзь халоднае;
- у выпадку з'яўлення рэзкай слабасці, задышкі, пацямнення ў вачах, сінюшнасці або рэзкага пачырванення скуры, халоднага поту, ацёку твару, сутаргаў або страты прытомнасці — неадкладна выклікайце хуткую медыцынскую дапамогу;
- да прыезду брыгады хуткай дапамогі назірайце за пацярпелым: праверце стан дыхання (наяўнасць руху грудной клеткі) і сардэчнай дзейнасці (пульс на соннай артэрыі);
- калі пацярпелы ў прытомнасці, дайце яму супрацьалергічны прэпарат (супрасцін, ларатадзін і іншае);
- пры адсутнасці прытомнасці і наяўнасці пульсу на соннай артэрыі пацярпеламу неабходна надаць стабільнае становішча на баку;
- калі ж пульс на соннай артэрыі і дыханне адсутнічаюць, неадкладна прыступайце да правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх і закрытага масажу сэрца.

Аднак нягледзячы на тое, што сур'ёзныя рэакцыі на ўкус джаланосных насякомых здараюцца даволі рэдка, у кожнага чалавека індывідуальная рэакцыя. Таму пры першых прыкметах моцнай алергіі (цяжкае дыханне, ацёк Квінке і іншае) неабходна неадкладна звярнуцца да ўрача.

### ЯК ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА МАГЧЫМАЙ СУСТРЭЧЫ З ВУСАТЫМІ-«ПАЛАСАТЫМІ»?

Спецыялісты сцвярджаюць, што часта для свайго пражывання джаланосныя насякомыя выбіраюць чалавечае жыллё. Цяпло, вялікая колькасць цёмных месцаў, наяўнасць ежы — якое яшчэ месца можа быць больш выгодным для пражывання? Аднак людзям з такімі «суседзямі» можна толькі паспачуваць: восы і шэршні настолькі заўзята абараняюць свае гнёзды, што гатовыя атакаваць любога, хто паспрабуе да іх прыблізіцца.

Каб пазбегнуць непажаданага «суседства», трэба рыхтаваць свой дом загадзя. У прыватнасці, каб выключыць пранікненне насякомых пад дах дома або ў нішы, перад летнім сезонам варта агледзець памяшканні на гарышчы і ліквідаваць усе шчыліны. Калі ж гнёзды насякомых ужо ёсць і вы вырашылі пазбавіцца ад іх самастойна, каб пазбегнуць укусаў насякомых, неабходна помніць пра меры перасцярогі.

— Да знішчэння насякомых, а таксама іх гнёздаў варта прыступаць пасля заходу сонца, — рэкамендуе **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Асвятляць гняздо забараняецца, бо вы пабудзіце яго насельнікаў. Варта правільна апранацца: адзенне павінна быць са шчыльнай тканіны, не забудзьце пра пальчаткі і накамарнік або ахоўную сетку на галаву. Калі вы абралі найбольш папулярны спосаб пазбаўлення ад насякомых, акуратна надзеньце на гняздо шчыльны мяшок і зацягніце яго. Ад паверхні, да якой яно прымацавана, аддзяліце гняздо з дапамогай нажа або рыдлёўкі. Далей яго можна спаліць, закапаць або ўтапіць. Калі гняздо знаходзіцца ў зямлі, яго варта заліць вялікай колькасцю кіпеню.

Пачасціліся выпадкі і таго, калі людзі выяўляюць на тэрыторыі ўласных падворкаў змей. Пазаўчора з-за змяі, якая запаўзла пад парог хаты, жыхары вёскі Круціца, што ў Мінскім раёне, не маглі трапіць у дом. Спатрэбілася дапамога ратавальнікаў.

— У доме па вуліцы Савецкай, куды мы прыбылі на выклік, жывуць двое дарослых і трое малалетніх дзяцей, — расказаў **намеснік начальніка штаба ліквідацыі надзвычайных сітуацый цэнтра аператыўнага ўпраўлення Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Дзяніс ПРАКОФ'ЕЎ**. — Жанчына, якая нам тэлефанавала, паказала, дзе схавалася змяя. Разам з калегам спадручнымі сродкамі прымусілі змяю выпаўзці. Выкарыстоўваючы сродкі індывідуальнай аховы, мы злавілі змяю і на бяспечнай адлегласці ад хат выпусцілі яе ў натуральнае асяроддзе пражывання.

**Вераніка КАНЮТА.**

Радзіннае

# Палявыя экспедыцыі Вольгі Церашчатавай

**Унікальны навукова-даследчы і экспазіцыйна-выставачны праект «Я паехала з Лоева...» цяпер прадстаўлены ў Лоеўскім «Музее бітвы за Дняпро». Ён прысвечаны 95-й гадавіне з дня нараджэння знакамітага беларускага мастацтвазнаўца — Вольгі Церашчатавай.**

Яна нарадзілася на зямлі Лоеўшчыны, стала заснавальніцай і першым дырэктарам Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Выставачны праект распавядае, як 21 ліпеня 1926 года ў мястэчку Лоеў у сям'і нарадзілася дзяўчынка Воля. У 18 гадоў яна пакінула родны край. Вярнулася толькі праз сорак гадоў — ужо вядомай даследчыцай беларускай даўніны, кандыдатам навук, аўтарам мноства навуковых артыкулаў па гісторыі беларускай культуры і мастацтва, супрацоўніцай інстытута этнаграфіі, мастацтвазнаўства і фальклору Акадэміі навук БССР — загадчыцай аддзела і дырэктарам цэлага музея пры ім.

Так, у канцы 1960-х разам з аднадумцамі на ўласныя сродкі Вольга Церашчатава арганізавала экспедыцыі па Беларусі для збірання помнікаў нацыянальнай культуры. Яна ўзначальвала экспедыцыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, дзякуючы якім былі сабраныя сотні мастацкіх артэфактаў. На аснове тых калекцый і быў створаны Музей старажытнабеларускай культуры.





Па задуме арганізатараў, выставачная экспазіцыя — напамін і пра саму Вольгу Церашчатаву, і пра яе справу — палявыя экспедыцыі, работу этнографа і мастацтвазнаўца. Тут можна ўбачыць музейныя прадметы, сабраныя па ўсёй Беларусі, экспанаты са збораў мясцовых музеяў. Ёсць магчымасць ацаніць і экранную экспазіцыю з фрагментамі стужкі «Ваджэнне русалкі». Цікавасць выклікаюць палявыя дзённікі Вольгі Васілеўны, напісаныя ёю у экспедыцыях. У межах праекта экспануецца партрэт стваральніцы музея старажытнабеларускай культуры, які належыць пэндзлю Юрыя Піскуна — беларускага мастака і паплечніка Вольгі Церашчатавай.

— Ужо традыцыйна наш невялічкі музей неэтнаграфічнага профілю ладзіць выставачныя праекты і імпрэзы з акцыямі да Міжнароднага дня этнографа, — адзначаюць супрацоўнікі «Музея бітвы за Дняпро». — Сёння этнаграфія, антрапалогія, сацыяльная ці культурная, — гэта ўжо далёка не проста сяляназнаўства, якое вывучала традыцыйную вясковую культуру канца XIX — першай паловы XX стагоддзя. Сённяшняя класічная этнаграфія шмат у чым грунтуецца на здабытках этнаграфіі музейнай. А сама музейная даследчая работа, і не толькі фондавая, — гэта заўжды этнаграфічнае даследаванне. Вольга Церашчатава — прыклад той асобы, якая натхняе сучасных этнографаў і ўсіх музейных даследчыкаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота ДУК «Музей бітвы за Дняпро».**